

Włodzimierz Naumiuk





Уладзімір Наумюк

Włodzimierz Naumiuk- urodził się 18.03.1935 w Kaniukach w powiecie Zabłudów, województwie podlaskim, wykształcenie podstawowe, samouk. Syn krawca, wnuk cieśli, prawnuk flisaka.

Samorodny artysta, obdarzony talentem i tworzący z potrzeby serca.


Od 1950 pomagał u miejscowego cieśli, wycina nadokienniki, narożniki chat, ozdoby. Dzięki tej pracy poznaje właściwości materiału i zyskuje dużą łatwość obróbki drewna.

W latach 1960-1980 zajmował się wyrobem sztuki użytkowej dla „Cepelii", wytwarzał kubki, miski, solniczki, dłubanki. Oprócz tego rzeźbił, początkowo pamiątki- min. białowieskie żubry. Od 1973 stał się członkiem Stowarzyszenia Twórców Ludowych. Zaczął być doceniany, zyskał rozgłos, wzrosły zamówienia na jego prace. Ale on nie stracił ambicji i intuicji artystycznej, nie stał się wytwórcą seryjnych pamiątek. Jakby na marginesie pracy rzemieślniczej zaczęły powstawać rzeźby inspirowane dawnym malarstwem cerkiewnym. Nie mając żadnego teoretycznego przygotowania, jak też praktycznego kontaktu ze sztuką rzeźbiarską Włodzimierz Naumiuk zaczął wzorować się przede wszystkim na ikonach, które od najmłodszych lat widział zarówno na co dzień w domu, jak i podczas niedzielnych i świątecznych nabożeństw w parafialnej cerkwi w Rybołach. Powstały rzeźby, w których łatwo można dostrzec cechy charakterystyczne dla sakralnej sztuki bizantyjskiej, o czym świadczą proporcje figur, sposób przedstawiania twarzy oraz szat portretowanych postaci. U W. Naumiuka odczuwa się silne dążenie do tego, aby jego rzeźby mogły oddziaływać na widza w sposób podobny do ikony.

Z czasem rozszerzył tematykę na otaczających go ludzi. Został swoistym kronikarzem swojej wsi. Powoli rzeźbienie zaczęło stawać się główną treścią jego życia.

Od 1996 roku prowadzi Szkołę Rzeźby przy Miejskim Ośrodku Kultury w Zabłudowie.

Po dziś dzień mieszka w swojej rodzinnej wsi Kaniuki, nad brzegiem Narwi.



Wystawy zbiorowe:
1968- 1973 - Jarmark Płocki- kiermasz sztuki ludowej
1971- Salony Wystawowe Domu Chłopa, Warszawa- „Rzeźby Włodzimierza Naumiuka na tle tkanin białostockich"
1975- Berlin- Światowy Kongres Kobiet
1978 - Kraków- „Rolnik i jego praca w twórczości ludowej" (wyróżnienie)
1987- Warszawa - „Plastyka zdobniczo-obrzędowa Świąt Bożego Narodzenia" (I i II nagroda) Ciechanowiec- „Sztuka ludowa Białostocczyzny"
1996- Annency, Francja- Prezentacja Polskiej Sztuki Ludowej
- Chicago- „Polska Sztuka Ludowa"
2002 – na zaproszenie marszałka województwa podlaskiego brał udział w promocji kultury polskiej w Belgii,
2003 - Szwecja- promocji kultury polskiej
Wielokrotnie uczestniczył w targach, jarmarkach i plenerach twórczości ludowej w Kazimierzu nad Wisłą, Płocku, Lublinie, Białymstoku, Zambrowie, Narewce, Grodnie

Wystawy indywidualne:
1970 – Bielsk Podlaski- „Rzeźby Włodzimierza Naumiuka"
1973- Białystok- Towarzystwo Przyjaciół Sztuk Pięknych
1979- Warszawa- Warszawskie Centrum Studenckiego Ruchu Naukowego
1989- Białystok -Muzeum Podlaskie Ratusz
1995- Hajnówka- wystawa w ramach „XIV Międzynarodowego Festiwalu Muzyki Cerkiewnej"
1998- Warszawa- „Rzeźby Włodzimierza Naumiuka"
2004 – Hajnówka- Muzeum i Ośrodek Kultury Białoruskiej
2010 – Białystok- Książnica Podlaska, „Sen drewna i jawa życia"
2011- Białystok - centrum L. Zamenhofa „Summa w drewnie"

Nagrody:
Od 1973 członek Stowarzyszenia Twórców Ludowych
2003- tytuł Honorowego Obywatela Miasta Zabłudowa
2005 - Nagroda Im. Oskara Kolberga „Zasłużony dla Kultury Ludowej"
2005 - Brązowy Medal „Zasłużony kulturze- Gloria Artis"
Brązowy Krzyż Zasługi - nadany przez Prezydenta RP
Złota Odznaka „Zasłużony Białostocczyźnie"

RZEŹBY WŁODZIMIERZA NAUMIUKA W KOLEKCJACH PAŃSTWOWYCH I PRYWATNYCH ŚWIATA :

POLSKA:
Białystok - *Muzeum Podlaskie*
Hajnówka - *Muzeum i Ośrodek Kultury Białoruskiej*

NIEMCY

FRANCJA

BIAŁORUŚ

WŁOCHY

WATYKAN

KANADA

NORWEGIA- Spitsbergen- *w kapliczce, którą zbudowali sobie polarnicy*

Opracowano na podstawie:
1. Ekspedycji etnograficznej Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej w Hajnówce w 2009 r.
2. Artykułów i notek prasowych z archiwum Włodzimierza Naumiuka
3. Jan Leończuk, Jacek Lulewicz „Drzewo życia, czyli o Włodzimierzu Naumiuku rzeźbiarzu z Kaniuk", Zabłudów 1997

Уладзімір Наумюк - нарадзіўся 18.03.1935 у Канюках у павеце Заблудаў, Падляшскага ваяводства, базавая адукацыя, самавук. Сын краўца, унук цеслі, праўнук рэтмана
Самародны мастак, адораны небывалым талентам, творыць з патрэбы сэрца.
З 1950 дапамагаў мясцоваму цясляру, вырэзваў надвакონнікі, вуглавыя і іншыя аздобы хат. Дзякуючы гэтай працы пазнаў уласцівасці матэрыялу і навучыўся лёгка апрацоўваць драўніну.
У 1960-1980 гадах займаўся вытворчасцю дэкаратыўна-прыкладных рэчаў для „Cepelii", рабіў кубкі, міскі, сальнічкі, доўбанкі. Апрача таго рэзаў, сувеніры, напрыклад, белавежскіх зубраў. З 1973 года стаў сябрам Аб'яднання Народных Творцаў. Талент Уладзіміра Наумюка ацанілі. Ён стаў папулярным. Павялічылася колькасць заказаў на яго працы, але гэта не паўрплывала на яго творчасць, не пераўтварыўся ён у вытворцу серыйных сувеніраў. Паралельна з рамесніцкай працай пачалі з'яўляцца творы, натхнёныя колішнім царкоўным мастацтвам. Не маючы ніякай тэарэтычнай падрыхтоўкі, ніякага практычнага кантакту з разьбярскім мастацтвам Уладзімір Наумюк бярэ прыклад перадусім з іконаў, якія з наймалодшых гадоў штодзённа бачыў у хаце і падчас нядзельных службаў у царкве ў Рыбалах. З'явіліся працы, у якіх выразна чытаюцца рысы, характэрныя сакральнаму візантыйскаму мастацтву, пра што сведчаць прапорцыі фігураў, спосаб паказання твараў і вопраткі партрэтных постацяў. Уладзімір Наумюк стараецца, каб яго разьба прамаўляла да гледача так, як прамаўляе ікона.
З часам мастак пашырае тэматыку, уключыўшы тое, што вакол, сваіх людзей. Становіцца своеасаблівым летапісцам жыцця роднай вёскі. Мала-памалу мастацтва разьбы становіцца сэнсам яго жыцця.
З 1996 году вядзе Школу Разьбы, якая існуе пры гарадскім асяродку культуры ў Заблудаве.
По сённяшні дзень жыве ў сваёй роднай вёсцы Канюкі на беразе ракі Нарва.



Калектыўныя выставы:
1968- 1973 – Плоцкі Кірмаш – кірмаш народнага мастацтва
1971- Выставачныя Салоны Дому Селяніна, Варшава - „Разьба Уладзіміра Наумюка на фоне беластоцкіх тканінаў"
1975 – Берлін – Сусветны Кангрэс Жанчын
1978 – Кракаў - „Селянін і яго праца ў народнай творчасці" (вылучэнне)
1987- Варшава - „Дэкаратыўна-абрадная мастацтва Святаў Божага Нараджэння" (I і II узнагарода)
Цехановец - „Народнае мастацтва Беласточчыны"
1996 – Анэнсі, Францыя – Паказ польскага народнага мастацтва
- Чыкага - „Польскае Народнае Мастацтва"
2002 – па запрашэнні маршалка Падляшскага ваяводства прымаў удзел у прасоўванні польскай культуры ў Бельгіі, 2003 – Швецыя прасоўванне польскай культуры
Шмат разоў удзельнічаў ў кірмашах і пленарах народнай творчасці ў Казімеры над Віслай, Плоцку, Любліне, Беластоку, Замбраве, Нараўцы, Горадні

Індывідуальныя выставы:
1970 – Бельск Падляшскі - „Разьба Уладзіміра Наумюка"
1973- Беласток – Таварыства Сяброў Выяўленчага Мастацтва
1979- Варшава – Варшаўскі Цэнтр Студэнцкага Навуковага Руху
1989- Беласток – Падляшскі Музей. Ратуша
1995- Гайнаўка – выстава ў межах „XIV Міжнароднага Фестываля Царкоўнай Музыкі"
1998- Варшава - „Разьба Уладзіміра Наумюка"
2004 – Гайнаўка – Музей і Асяродак Беларускай Культуры
2010 – Беласток – Ксёнжніца Падляшская, „Сон дрэва, ява жыцця"
2011 – Беласток - „Сума ў драўніне", Цэнтр імя Людвіга Заменгофа

Узнагароды:
З 1973 сябра Аб'яднання Народных Творцаў
2003- званне Ганаровага Грамадзяніна горада Заблудаў
2005 – Узнагарода імя Оскага Кольберга „Заслужаны для Народнай Культуры"
2005 – Бронзавы Медаль „Заслужаны культуры – Gloria Artis"
Бронзавы Крыж Заслугіі
Залатая Адзнака „Заслужаны Беласточчыне"

ПРАЦЫ УЛАДЗІМІРА НАУМЮКА Ў ДЗЯРЖАЎНЫХ І ПРЫВАТНЫХ КАЛЕКЦЫЯХ:

ПОЛЬШЧА:
Беласток- *Музей Падляшскіу*
Гайнаўка- *Музей і Асяродак Беларускай Культуры*

КАНАДА

НЯМЕЧЧЫНА

ВАТЫКАН

ФРАНЦЫЯ


БЕЛАРУСЬ

НАРВЕГІЯ-Шпіцберген- *у каплічцы, якую сабе пабудавалі палярнікі.*

Апрацавана на аснове:
1. этнаграфічнай экспедыцыі Музея і Асяродка Беларускай Культуры ў Гайнаўцы ў 2009 годзе.
2. артыкулаў і прэсавых запісак з архіва Уладзіміра Наумюка
3. Jan Leończuk, Jacek Lulewicz „Drzewo życia, czyli o Włodzimierzu Naumiuku rzeźbiarzu z Kaniuk", Zabłudów 1997

Technika i materiał:

- rzeźbi w gruszy, klonie, brzozie, lipie, chwali sobie lipę białowieską *„ma najpiękniejszą strukturę, miodowy kolor, głębię”.“Lipa jest najłatwiejsza do rzeźbienia, bo miękka, ale twarz z niej wyrzeźbiona jest martwa. Twarz rzeźbiona z akacji czy gruszy- żyje”.* Wykorzystywał także „czarny dąb” stary dąb wydobyty z dna Narwi, który wskutek długotrwałego działania wody stał się zupełnie czarny
- stara się nadać możliwie najdoskonalszy kształt, wykorzystuje naturalne uroki surowego drewna- układ słoi, łyżki, skazy, które pełnią nierzadko rolę dodatkowych elementów dekoracyjnych



Cechy charakterystyczne twórczości:

- Trudno jest jednoznacznie sklasyfikować rzeźby. Tematyka przemawia za ich ludowością. Sama kompozycja, technika i daleko posunięta precyzja wykonania oddalają je jednak znacznie od ludowego prymitywizmu.
- Rzeźba jego tkwi mocno w tradycji sztuki ludowej i w kręgu wiejskich ludzi, prac i problemów - mieszkańców ubogich wiosek dorzecza górnej Narwi. Jest w niej melancholia i zamyślenie.
- Dla społeczności Kaniuk sztuka Naumiuka jest poza sferą ich doznań estetycznych. Nie ma w niej barwności ludowych tkanin czy ceramiki. Jest zbyt smutna i schematyczna, postacie są zbyt stylizowane.
- W statycznych rzeźbach zwracają uwagę otwarte, nad wyraz ekspresyjne wpatrzone w wieczność oczy- jedyny żywszy akcent a zarazem jedna z najważniejszych cech twórczości Włodzimierza Naumiuka- w których zawiera się życie lub uczucia wielu bohaterów jego dzieł
- ciekawsze tematy powiela, jedne przekształca szukając nowych rozwiązań, inne dość wiernie kopiuje.

-Tematyka religijna wyrastająca w tradycji kultury prawosławnej. pozbawionej rzeźby sakralnej. Inspiracją były ikony: św. Piotr i Paweł, św. Jan Ewangelista, Św. Cyryl i Metody, Matka Boska, o pociągłych, obliczach, z których bije zarówno dostojeństwo jak i głęboka, wewnętrzna mądrość.Rzeźbi także postacie Chrystusa Frasobliwego i rożne „świątki” zaczerpnięte z ikonografii katolickiej.

-Tematyka świecka: siewca, pastuszek, rybak, rolnicy, rybacy, starcy, dzieci, kobiety przy zwykłych zajęciach gospodarskich- najwięcej rzeźbi zwykłych, wioskowych ludzi; *„Chcę utrwalić wieś starą, wieś niepowrotna, która lada chwila od nas odejdzie i chcę egzemplarzy jak najwięcej zrobić dopóki jeszcze czas”.*

- W rzeźbach dominuje pewien typ fizjologiczny twarzy- nieswiadome (?) naśladownictwo rysów dziadka, po którym został paszport z 1914 roku, chata, żarna i wspomnienia…

ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ ТВОРЧАСЦІ:

- Цяжка адназначна класіфікаваць разьбу. Тэматыка дадае ёй народнасці. Кампазіцыя і тэхніка, а таксама вялікая дакладнасць аддаляюць творы ад народнага прымітывізма.
- яго разьба глыбока закаранёна ў традыцыі народнага мастацтва і у коле вясковых людзей, іх працы і клопатаў жыхароў бедных вёсак даліны верхняй Нарвы. Ёсць у іх меланхолія і задума.
- для жыхароў Канюк мастацтва Наумюка знаходзіцца па-за сферай іх эстэтычных перажыванняў. Няма ў ёй колернасці народных тканінаў ці керамікі. Яна занадта сумная і схематычная, постаці вельмі стылізаваныя.
- у статычных рэзьбах прыцягваюць увагуw адкрытыя, моцна экпрэсіўныя вочы, якія углядаюцца ў вечнасць, - адзіны жывейшы акцэнт і адначасна адна з важнейшых рыс творчасці Уладзіміра Наумюка – у гэтых вачах засяроджана жыццё, пачуцці усіх герояў яго мастацтва.
- цікавыя тэмы паўтарае, адны пераўвасабляе, шукаючы новыя рашэнні, іншыя даволі дакладна капіруе.
- Рэлігійная тэматыка вырастае з традыцыі праваслаўнай культуры. у якой няма сакральнай разьбы. Натхненнем былі іконы: святых Пятра і Паўла, святога Іаана Евангеліста, святых Кірыла і Мяфодзія, Божай Маці, - з твараў якіх праменіцца і годнасць, і глыбокая унутраная мудрасць. Таксама постаці Журботнага Хрыста і розныя „сьвёнткі” падгледжаныя ў каталіцкай іканаграфіі

-Свецкая тэматыка: сейбіт, пастушок, рыбак, селянін, старыя, дзеці, жанчыны падчас звыклых гаспадарскіх прац, найбольш “рэжа” звычайных вясковых людзей; *„Хачу захаваць старую вёску, якая ўжо не вернецца, якая праз момант канчаткова знікне, хачу зрабіць як мага больш, пакуль яшчэ час”.*

У разьбе дамінуе тып філасофскага твару – несвядомае(?) капіраванне рысаў дзядулі, пасля якога застаўся пашпарт з 1914 года, хата, жорны і ўспаміны …

ТЭХНІКА І МАТЭРЫЯЛ:

- Рэжа ў грушы, клёне і бярозе, таксама ў ліпе, асабліва любіць ліпу з Белавежскай пушчы *„яна мае найпрыгажэйшую структуру, мёдавы колер і глыбіню”.“Некаторыя віды дрэў маюць большую вартасць. Напрыклад, ліпа – самая падатлівая, але выразаны ў ёй твар – мёртвы. Твары, выразаныя ў грушы або ў акацыі – жывыя”.* карыстаў таксама “чорны дуб” – стары дуб, падняты з дна Нарвы, які пасля шматгадовага ўздзеяння вады стаў зусім чорным.
- Стараецца прыдаць найдасканальнейшую форму, выкарыстоўвае натуральную прыгажосць сырой драўніны – палажэнне слояў, лыжкі, недасканаласцяў, якія часта становяцца дадатковымі элементамі дэкору



Najważniejsze dzieła / Найважнейшыя творы:



-„Czarna Madonna" (czarny dąb, lata 60-te XX wieku) której nie sprzeda za żadne pieniądze, ma w sobie tajemniczy urok rzeźb bizantyńskich: ciemne oblicze o pięknych, pociągłych pełnych dostojeństwa rysach

-„Чорная Мадона" (чорны дуб, 60-я гады XX стагоддзя), якую не прадасць ні за якія грошы, якая мае ў сабе таямнічую прыгажосць візантыйскай разьбы: цёмнае аблічча з прыўкраснымі, поўнымі годнасці рысамі



- "Potwór morski" (wierzba, 1965?) nie istnieje; twarz wyrzeźbiona w wierzbie, która rosła koło domu artysty

-„Марская пачвара" (вярба, 1965?) не існуе; твар, выразаны ў вярбе, якая расла ля дому мастака



- „Św. Piotr i Paweł"- najciekawsze osiągniecie. Dwie głowy realistyczne na wspólnym korpusie, na którym płytkim rytem zaznaczone tylko symbole apostołów- przykład autentycznej sztuki ludowej z niezwykle silnym wpływem motywów cerkiewnych. „Jednego oni mieli nauczyciela, jednego zrozumieli, jedną drogą poszli- dlatego dałem jeden korpus dla nich, jedno serce- gdzie umieściłem dwie Madre głowy"

- „Святыя Пётр і Павал"- найцікавейшае дасягненне. Дзьве рэалістычныя галавы на адным супольным корпусе, па якім плыткім рытам толькі пазначаныя постаці апосталаў – прыклад аўтэнтычнага народнага мастацтва з нязвыкла вялікім уплывам царкоўных матываў. „Аднаго яны мелі настаўніка, аднаго зразумелі, адным шляхам пайшлі – таму я даў ім адзін корпус, адно сэрца – дзе змясціў дзьве Разумныя галавы "






„Może kiedyś wyrzeźbię coś takiego, co będzie moim pradziadkiem i dziadkiem, i ojcem, będzie to też mną. Może wyrzeźbię cos takiego, co będzie symbolizowało całe zmarłe pokolenie moich przodków i nie tylko moich, całe pokolenie chłopów naszego kraju. Ich życiorysy były proste, ale obfitowały też w dramatyczne wydarzenia- jak mojego dziadka i ojca, którzy mieli swój udział w obronie tej ziemi przed obcymi...”

Wlodzimierz Naumiuk

„Можа, некалі выражу нешта такое, што будзе маім прадзедам, дзедам і бацькам, будзе таксама мною. Можа, выражу нешта такое, што будзе сімвалам усяго памерлага пакалення маіх продкаў і не толькі маіх, цэлага пакалення сялян нашай краіны. Іх біяграфіі былі простымі, але адначасна поўнымі драматычных здарэнняў – як майго дзеда і бацькі, якія мелі свой удзел у абароне гэтай зямлі ад чужынцаў...”

Уладзімір Наумюк



„Прырода з’яўляецца для мяне непадзельнай цэласцю, святыняй, у якой мне прасцей, чым у царкве, гутарыць з Богам.”
Цяжка яму расстацца са сваімі рэзьбамі. „(...) не мушу расставацца з тымі, якія ўжо ёсць. Кожная мае свае рысы, сваю індывідуальнасць, сваю біяграфію. Я з імі ў сяброўстве”.

Уладзімір Наумюк, 1995

„Natura jest dla mnie nierozdzielną całością, świątynią, w której łatwiej mi niż w cerkwi rozmawiać z Bogiem.”
Trudno mi się rozstać ze swoimi rzeźbami. „(...) nie muszę rozstawać się z tymi, które już są. Każda ma indywidualne rysy, własną osobowość, życiorys. Jestem z nimi zaprzyjaźniony”.

Włodzimierz Naumiuk, 1995





Rzeźby Włodzimierza Naumiuka w kolekcji Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej w Hajnówce

Працы Уладзіміра Наумюка ў калекцыі Музея і Асяродка Беларускай Культуры ў Гайнаўцы



Zakup rzeźb zrealizowano dzięki dotacji Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego

„Postacie statyczne, bardzo zwarte, niemal hieratyczne. Dolna część sylwetki jest z reguły zdecydowanie słabiej opracowana pod względem rzeźbiarskim. Uwaga artysty koncentruje się na górnej części korpusu, na ramionach i twarzy, przede wszystkim zaś na niesłychanie ekspresyjnych, żywych oczach.
W jego rzeźbach próżno szukać banalizacji treści, czy powtórzeń raz osiągniętej doskonałości formy. Włodzimierz Naumiuk to artysta, któremu dało się osiągnąć bardzo wiele ekspresji przy pomocy bardzo skromnych środków wyrazu. Tylko nielicznym artystom udało się osiągnąć ten cel, bo tylko nieliczni zostali obdarzeni talentem tej miary.”

Joanna Tomalska
- kustosz Muzeum Okręgowego w Białymstoku, historyk sztuki, krytyk sztuki



„Статычныя постаці, вельмі кампактныя, амаль гератычныя. Ніжняя частка фігуры, звычайна, з разьбярскага пункту гледжання, слабей апрацавана. Увага мастака канцэнтруецца на верхняй частцы корпусу, на плячах і твары, а, перадусім, на надзвычай экспрэсіўных, жывых вачах у яго разьбе марна шукаць банальнасці зместу, або паўтораў раз дасягнутай дасканаласці формы. Уладзімір Наумюк – гэта мастак, якому ўдалося дасягнуць шмат экспрэсіі пры дапамозе вельмі сціплых сродкаў выразу. Нямногім мастакам удалося дасягнуць такі вынік, бо толькі нямногія былі адораныя талентам такой велічыні.”

Яанна Тамальская
– кусташ Акружнога Музея ў Беластоку, гісторык мастацтва, мастацкі крытык

Powstało już kilka wydawnictw, materiałów radiowych i telewizyjnych o rzeźbach, ale i swoistej filozofii Włodzimierza Naumiuka. Filozofii spokoju i uwielbienia dla przyrody. *„Lubię odszukać taki materiał, gdzie przyroda dużo sama tworzy, jakby zwalniała rzeźbiarza z większego wysiłku”. „Matki, zawsze zadumane, zawsze tulą swoje dzieci do siebie, oddając ciepło i miłość”* – to tylko kilka cytatów, myśli Włodzimierza Naumiuka, którego nie tylko twórczość warta jest poznania.



Stowarzyszenie Muzeum i Ośrodek
Kultury Białoruskiej w Hajnówce
17-200 HAJNÓWKA, ul. 3 Maja 42
muzeumbialoruskie@home.pl
www.muzeumbialoruskie.hajnowka.pl

Projekt graficzny: Agnieszka Tichoniuk / Графічны праект: Агнешка Тіханюк
Tłumaczenia: Natalia Gierasimiuk / Пераклад: Наталля Герасімюк
Foto: Agnieszka Tichoniuk, Tomasz Tichoniuk / Фото: Агнешка Тіханюк, Тамаш Тіханюк

MSWiA

Projekt realizowany jest dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji
w ramach realizacji zadania pn. *"Białoruski Alfabet Sztuki"*.
Праект здзяйсняецца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністэрства Унутраных
Спраў і Адміністрацыі ў межах задання *"Беларускі Алфавіт Мастацтва"*.